№6(6) 12.04.2012

# САЛІDАРНАСЦЬ

Інфармацыйны бюлетэнь Беларускага Незалежнага прафсаюза **Мікашэвічы**

МЕРКАВАННЕ
**“РАБОЧЫМ ПАШКОДЗІЛІ НЯ САНКЦЫІ, А ЎРАД”** ст. 2

САЛІДАРНАСЦЬ
**ВЕНЕСУЭЛЬСКИЕ ПРОФСОЮЗЫ МАССОВО ПОДДЕРЖАЛИ РАБОЧИХ «ГРАНИТА»** ст. 3

ГРАМАДСТВА
**УВОЛЕННЫЙ ПРОФСОЮЗНЫЙ АКТИВИСТ ДОБИЛСЯ КОМПЕНСАЦИИ В 12 МИЛЛИОНОВ** ст. 4

# «Лунінецкі суд даў трэшчыну»

Лунінецкі раённы суд прызнаў законным звальненьне кіраўніка суполкі незалежнага прафсаюзу на прадпрыемстве «Граніт» у Мікашэвічах Алега Стахаевіча. Падтрымаць Алега прыехалі каля паўсотні лідэраў і актывістаў незалежных прафсаюзаў.




Алег Стахаевіч заявіў «Свабодзе», што лічыць незаконным рашэньне, якое вынес старшыня Лунінецкага суду Васіль Бельскі:

«Адмовілі ў пазове ў поўным аб’ёме. Усе нашы факты, усе нашы аргумэнты былі праігнараваныя. Усё дакладна так, як і з абскарджаньнем пазбаўленьня правоў у Берасьці. Анатоль Літвінка распавёў Алегу, што хадзіў пасьля суду ў кабінэт наконт скаргі Генадзя Паўлоўскага, якога таксама звольнілі. Ды заходзіць Бельскі і кажа на пракурорку: „Усё, мы з табой неўязныя“. А Анатоль яму кажа: чаго ён, маўляў, такі пэсымістычны… Сёньняшнія падзеі я магу акрэсьліць так: Лунінецкі суд даў трэшчыну».

Юрыст Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў Алена Яськова, якая прадстаўляла інтарэсы Стахаевіча, адзначыла:

«З пункту гледжаньня працоўнага заканадаўства, прафсаюзнага заканадаўства мы свае патрабаваньні пацьвердзілі і абгрунтавалі. Аднак судовая пэрспэктыва гэтай справы мне была зразумелая, на жаль, загадзя. Канечне, рашэньне гэтае незаконнае, і выступленьне таго ж пракурора было юрыдычна няграматнае. З прававога гледзішча была вельмі слабая матывацыя пракурора.Там размова ішла пра мэтазгоднасьць перанавучаньня Стахаевіча.



Апанэнты даводзілі, што гэта вызначае наймальнік. Хоць падчас звальненьня па гэтым артыкуле — гэта не яго права, а абавязак».

Спадарыня Яськова распавяла, што ўсе абставіны звальненьня Стахаевіча будуць прадстаўленыя міжнароднай грамадзкасьці і адпаведным міжнародным арганізацыям:

«Усе абставіны яго звальненьня ўжо зараз прымацаваныя да справы 2090 аб парушэньні правоў прафсаюзаў і працоўных у Беларусі. І ўсе гэтыя вынікі судовага разгляду мы таксама накіруем у Міжнародную арганізацыю працы ў дадатку да гэтай справы. І я думаю, што на вясновай канфэрэнцыі Міжнароднай

*працяг на стр.2*



# «Лунінецкі суд даў трэшчыну»



пачатак на стр.1

арганізацыі працы гэта будзе таксама прадметам разгляду. І, канечне, ня будзе стаяць пытаньня аб вяртаньні прэфэрэнцыяў. А паколькі абвастрыўся і на іншых прадпрыемствах ціск на незалежныя прафсаюзы, то магчыма, што будзе спэцпараграф».

ПРАФСАЮЗ

Алега Стахаевіча звольнілі з «Граніту», пазбавіўшы перад гэтым правоў кіроўцы. Ён працаваў кіроўцам «БелАЗу». Пры звальненьні кіраўніку незалежнага прафсаюзу не прапанавалі ніякай іншай пасады на «Граніце», нягледзячы на тое, што ён мае адмысловую адукацыю.

Напрыканцы 2011 году некалькі соцень працаўнікоў прадпрыемства па здабычы будаўнічага каменю «Граніт» у Мікашэвічах (Берасьцейская вобласьць) напісалі заявы, што выходзяць з афіцыйнага прафсаюзу. Рабочыя абвясьцілі, што ствараюць на прадпрыемстве суполку Беларускага незалежнага прафсаюзу. Адразу ж сябры незалежнага прафсаюзу адчулі ціск з боку адміністрацыі.

«РАДЫЁ СВАБОДА»

# “РАБОЧЫМ ПАШКОДЗІЛІ НЯ САНКЦЫІ, А ЎРАД”

Прэзыдыюм рады Фэдэрацыі прафсаюзаў Беларусі прыняў зварот, у якім асуджае ўвядзеньне Эўразьвязам эканамічных санкцыяў у дачыненьні да прадпрыемстваў краіны, паведамляе Інтэрфакс.

У заяве гаворыцца, што санкцыі «найперш нэгатыўна адаб’юцца на працоўных беларускіх прадпрыемстваў… Увядзеньне санкцыяў Эўразьвязам можа пацягнуць за сабою зьніжэньне прыбыткаў прадпрыемстваў, скарачэньне вытворчасьці і працоўных месцаў, недаатрыманьне працоўнымі гарантаваных калектыўнымі дамовамі выплат, складанасьці ў працэсе павелічэньня заработнай платы працоўных».

23 сакавіка Эўрасаюз ухваліў эканамічныя санкцыі ў дачыненьні да 29 беларускіх кампаній.

Факт зьяўленьня звароту камэнтуе кіраўнік незалежнага прафсаюзу «Граніту» **Алег Стахаевіч**:



- «Кожны разумее, што найбольшую шкоду рабочым нанёс урад. Бо крызіс, які ўзьнік і працягваецца, — гэта ж не віна санкцыяў, правільна? А заява — гэта страх страціць кантроль над людзьмі. Усе разумеюць, што ФПБ-шныя прафсаюзы — гэта прафсаюзы самой улады. А ўлада нас па тэлебачаньні корміць дэзынфармацыяй, пустымі абяцанкамі. Хлопцы з прадпрыемстваў кажуць, што мы гатовыя пацярпець месяц-два, абы толькі сытуацыя памянялася.

За 11 гадоў, якія працаваў, ані разу не было такога, каб афіцыйны прафсаюз прыходзіў, размаўляў зь людзьмі, цікавіўся, якія ёсьць праблемы, цяжкасьці, спрабаваў іх неяк разьвязаць».

- Прафсаюзны лідэр **Аляксандар Бухвостаў**: «Фэдэрацыя прафсаюзаў абараняе пазыцыю ўраду і кіраўніцтва рэспублікі, якія фактычна пазбавілі працоўных усіх правоў. Гэта фактычна філіял Адміністрацыі прэзыдэнта. Яны падманваюць людзей у тым, што вінаватыя тыя, хто патрабуе санкцыяў. Дый санкцыяў ніхто не патрабуе.



А ў рэспубліцы цяпер не забясьпечваюцца правы працоўных. Пра гэта ўжо 12 гадоў разглядаецца пытаньне ў Міжнароднай арганізацыі працы. Людзі ня могуць вольна працаваць, бо яны зьвязаныя кантрактнай сыстэмай, іх прымушаюць падпісваць разнастайныя паперы пра тое, што яны ня будуць пратэставаць, удзельнічаць у грамадзянскіх дзеяньнях, масавых мерапрыемствах».

## Контактные телефоны Белорусского Независимого профсоюза

**Зимин Николай** — Председатель тел. м.:____________________ +37529 6382657
**Швец Юрий** — Вице-председатель тел. м.: ______8029 7327782; т. 8 (0236) 373977
**Перминов Иван** — Вице-председатель тел. м.: _________________8029 6330917
**Гринцевич Снежана** – глав.бух., зав.оргогдела тел. м.: ___________8029 7613096
**Довнар Александр** – референт председателя тел. м.: ____________8029 2729689
**Ерошеня Роман** – пресс-атташе тел. м.: _________________________8029 5703493

**Белорусский Конгресс Демократических профсоюзов**

**Ярошук Александр** - председатель БКДП тел. м.: _____________+37529 6161151
**Еськова Елена** - юрист БКДП тел. м.: _+37529 6050194; т. 8 (017) 2148905; 2148906
**Антусевич Сергей** — Зам. председателя тел. м.: ______________+37529 6762973
**Лазовский Владимир** - Гл. технический инспектор тел. м.: _______8029 6052912

web: http://belnp.org; E-mail: bnpsoligorsk@gmail.com; Skype: nikolaizimin-bnp

# Венесуэльские профсоюзы массово поддержали опальных рабочих «Гранита» в Микашевичах

Более двух десятков представителей профсоюзов и народных групп Венесуэлы подписали обращение международной солидарности с опальными белорусскими рабочими, членами первичной организации Белорусского независимого профсоюза на заводе «Гранит» в Микашевичах.



Как сообщает во вторник из Каракаса сайт Aporrea.org, заявление звучит от имени целого ряда различных профсоюзных организаций Венесуэлы.

САЛІДАРНАСЦЬ

«Для единства и борьбы мирового рабочего класса против капитализма! Поддержим белорусских рабочих!», — под таким призывом появилось обращение, которое, как сообщается, направлено администрации РУПП «Гранит», генпрокурору Беларуси, главе президентской администрации Владимиру Макею.

«Из Венесуэлы мы заявляем о нашей непреклонной солидарности с рабочими завода «Гранит». Мы поддерживаем наших братьев по классу, которые вступили в бой с работодателем, не соблюдающим трудовые права…

Мы выступаем категорически против агрессии со стороны нанимателя, а также незаконного увольнения Олега Стахаевича и Людмилы Литвинко!

Нет терроризму со стороны руководства завода!».

Подписанты также требуют от белорусских властей немедленного признания независимых профсоюзов, подытоживая: «Да здравствует международная солидарность трудящихся!»

Под обращение подписались лидеры и активисты более двух десятков профсоюзов и народных групп Венесуэлы.

Напомним, в конце декабря 2011 года более двухсот рабочих «Гранита» вышли из действующей на предприятии официальной профсоюзной организации и заявили о намерении создать первичную структуру БНП, после чего у многих из них начались проблемы.

20 февраля руководству РУПП «Гранит» было передано их заявление, в котором опальные рабочие сообщили о намерении провести предупредительную забастовку в случае невыполнения следующих требований: немедленно прекратить дискриминацию по профсоюзному признаку; восстановить на работе незаконно уволенных Людмилу Литвинко и профсоюзного лидера Олега Стахаевича; предоставить помещение для работы первички.

РУПП «Гранит» является градообразующим предприятием в Микашевичах и одним из крупнейших в Европе по добыче и переработке плотных горных пород.

Илья ГОРИН, gazetaby.com

# Рабочие Калужского автопрома солидарны с членами Независимого профсоюза РУПП «Гранит»

«Держитесь до конца! Ваша победа придаст силы рабочим во всем мире! Мы же, со своей стороны, предпримем всё возможное для того, чтобы вам помочь», — с такими словами члены профсоюзов предприятий Калуги «Фольксваген» и «Бентелер Аутмотив», входящих в Межрегиональный профсоюз работников автомобильной промышленности (МПРА) обратились к рабочим РУПП «Гранит» г. Микашевичи.

Мы, калужские рабочие, выражаем солидарность с работниками РУПП «Гранит», рискнувшими создать на своём предприятии организацию Белорусского независимого профсоюза. Борьба за свои права, что в России, что в Беларуси — нелегкое дело, в котором рабочим нередко приходится противостоять не только администрации своего предприятия, но и правительственным структурам. Мы знаем, что выход из лукашенковских профсоюзов сам по себе акт гражданского мужества. Работники РУПП «Гранит» подвергаются запугиванию посредством манипулирования процессом аттестации работников, а председатель профсоюза Олег Стахаевич и активистка Людмила Литвиненко были уволены. Сейчас ведется судебное разбирательство, в ходе которого независимые профсоюзы пытаются восстановить уволенных.

Мы, как никто другой, знаем, что слова «рабочая солидарность» и «братство» не пустой звук. Когда бастовали рабочие завода Бентелер Аутмотив, мы получали помощь и письма поддержки не только со всей страны, но и из-за границы. Взаимодействие рабочих разных стран — ключевое условие для изменения ситуации для всех трудящихся!

Желаем Вам сил и терпения в вашей нелёгкой борьбе.

Держитесь до конца! Ваша победа придаст силы рабочим во всем мире! Мы же, со своей стороны, предпримем всё возможное для того, чтобы вам помочь.

Профком ППО МПРА
Фольксваген — Калуга
Профком ППО МПРА Бентелер
Аутмотив — Калуга

# УВОЛЕННЫЙ ПРОФСОЮЗНЫЙ АКТИВИСТ ДОБИЛСЯ КОМПЕНСАЦИИ В 12 МИЛЛИОНОВ

Алексей Павловский судился с ОАО «Промжилстрой», и представители предприятия решили подписать с бывшим сотрудником мировое соглашение на его условиях. Активист готовит очередной иск – на этот раз против официального профсоюза.

Напомним, в январе руководство ОАО «Промжилстрой» заявило о расторжении контракта с активистом профсоюза работников РЭП, каменщиком Алексеем Павловским. Во время работы на строительном предприятии он вместе с другими работниками неоднократно обращался в различные инстанции с просьбой устранить нарушения норм по охране труда и трудового законодательства, что, по его мнению, «начальству не понравилось».

После новости об увольнении Павловского, его коллеги направили коллективное заявление на имя директора с требованием продлить контракт каменщику и даже готовы были уволиться в знак солидарности с ним. Однако под давлением администрации вынуждены были отозвать свои заявления.

Алексей Павловский решил сам досрочно уволиться, ссылаясь на нарушения нанимателем условий контракта. На начавшемся судебном разбирательстве стало ясно, что у рабочего есть доказательства нарушений, подтвержденные государственными структурами.

– Для проверки мы предоставили только 28 нарушений, но их было больше. В «Промжилстрое» нарушают все, что можно, – уточнил Алексей Павловский, – Идя в суд, они думали, что у меня возникнет проблема с доказательствами. Но в итоге приняли все мои условия: признали, что я прервал контракт из-за нарушений его условий со стороны нанимателя. Дальше дело не рассматривали. Им так было проще договориться, чем ждать всех проверок по моим жалобам.

12 апреля стороны подписали мировое соглашение. Предприятие обязалось выплатить бывшему сотруднику 11 миллионов 662 тысячи помощи, предусмотренной законом в случаях таких увольнений.

Безработный с 10 февраля Алексей Павловский, пока не может трудоустроиться. Когда он обращается по объявлениям, ему отвечают, что человека уже нашли, его разряд не подходит или организации уже не нужен каменщик.

– Полученных денег от «Промжилстроя» должно хватить на некоторое время. Я сейчас могу заняться другим делом, но вообще-то каменщики в Могилеве очень нужны. Однако всюду наблюдаю дискриминацию. Если меня и дальше не будут брать на работу, то буду доказывать, что это нарушение моих прав, что нельзя человека не брать на работу из-за его профсоюзной активности, – рассказал корреспонденту «Салідарнасці» Алексей Павловский.

Тем временем, активист профсоюза РЭП готовит очередной иск – против официального профсоюза.

– Пусть занимаются своим делом, а не политикой. Недавно одна работница нефтеперерабатывающего завода заявила, что хочет судиться с Ивашкевичем из-за его призыва к санкциям, а профком поддержал. Поэтому будем готовить иск к этой организации. Профсоюзу нужно выполнять свою работу. Деньги получают, ничего не делают – так зачем нам вообще такой профсоюз? – объясняет Алексей Павловский.

Алина ТАРЯНИК

# ПРАФСАЮЗНАГА АКТЫВІСТА ЗВАЛЬНЯЮЦЬ ЗА ТРЫ ГАДЫ ДА ПЭНСІІ

Фармальная прычына — сканчэньне тэрміну дзеяньня працоўнага кантракту. Актывіст дапрацоўвае апошнія чатыры дні, паведамляе «Радыё Свабода».

Расюк: «Вы ж добра ведаеце, якія справы ў будаўніцтве цяпер. А я такі чалавек, што маўчаць ня буду. Інтэрвію я даваў пра стан будаўніцтва. Вось гэта ўсё і паўплывала на рашэньне аб маім звальненьні. Мяне ж добра ведаюць. Ім не патрэбны такі чалавек. Мяне нядаўна перавялі на іншую працу. Ранейшая арганізацыя „Інвэстсыстэм“ рассыпалася. Яе расфармавалі, даўгі павесілі на Ўпраўленьне капітальнага будаўніцтва. У ім я адпрацаваў месяцаў пяць. Цяпер буду беспрацоўны. Буду лячыць сваё здароўе. Новае начальства, пэўна, ведала пра маё здароўе, але ж маглі і іншую працу прапанаваць».

Ва упраўленьні капітальнага будаўніцтва звальненьне Мікалая Расюка тлумачаць вытворчай неабходнасьцю:

“Мы выконваем функцыю заказчыка, але ж не будаўніка. Так атрымалася. Гэта ж не маё рашэньне”, — тлумачыць сытуацыю са звальненьнем Расюка прадстаўнік адміністрацыі Ўпраўленьня капітальнага будаўніцтва.

Да пэнсіі Мікалаю Расюку тры гады. Ён ліквідатар-чарнобылец. Некалькі разоў спрабаваў ад імя апазыцыйных арганізацыяў выступіць на афіцыйным чарнобыльскім мітынгу. Гарвыканкам слова яму не даваў.

Мікалай Расюк стаў трэцім звольненым прафсаюзным актывістам у Магілёве. Раней былі звольненыя сябра прафсаюзу работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці, муляр Аляксей Паўлоўскі і сябра Свабоднага прафсаюзу мэталістаў, грузчык домабудаўнічага камбінату Алег Аксёнаў.

САЛІDАРНАСЦЬ Мікашэвічы
Наклад 299 экз.
Адказны за выпуск Раман ЕРАШЭНЯ
Адрас: 223710, г. Салігорск, вул.Набярэжная 8
Тэл.: (0174) 22 00 59
Надрукавана на абсталяваньні БНП.
Выдаецца на правах унутранай дакументацыі.
Распаўсюджваецца бясплатна.